# Фарміраванне ў дзяцей 5–6 гадоў граматычнага ладу маўлення



**СТАРЖЫНСКАЯ Наталля Сцяпанаўна**
доктар педагагічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Авалоданне дзецьмі граматычным ладам мовы, як і маўлення ў цэлым, ажыццяўляецца на аснове пазнавальнага развіцця. Станаўленне граматычных навыкаў з'яўляецца «спантанейным» (А. У. Запарожац) працэсам, гэта значыць, што дзіця «здабывае» мову, яе граматычную сістэму з фактаў маўлення, якое ім успрымаецца падчас камунікацыі з дарослым і равеснікамі. Засваенне мовы і формаў маўлення носіць у дзіцяці творчы характар, праяўляецца ў маўленчай і слоўнай творчасці. Яно абыгрывае слова або форму, што спадабалася, шматразова выкарыстоўвае іх у ініцыятыўным маўленні. Актыўная арыенціровачная пошукавая дзейнасць, эксперыментаванне, гульні са словам, а ў старэйшым дашкольным узросце і элементарнае асэнсаванне асобных граматычных фактаў граматыкі прыводзяць да асваення граматычнага ладу мовы, фарміравання здольнасці да адвольнага выкарыстання ў маўленні граматычных сродкаў. Педагагічнае ўздзеянне на гэты працэс самаразвіцця павінна ўлічваць логіку і вядучыя тэндэнцыі стыхійнага авалодання мовай.

Граматычная работа з дзецьмі азначае перш за ўсё стварэнне ўмоў для паўнавартаснага засваення граматычнага ладу мовы, багаццяў сінтаксічных, марфалагічных і словаўтваральных сродкаў на аснове развіцця і заахвочвання іх пошукавай актыўнасці ў сферы граматыкі, спантанных моўных гульняў, эксперыментавання са словам і яго формамі, на аснове маўленчай (слоўнай) творчасці ў розных формах зносін дарослага з дзецьмі.

Для фарміравання сінтаксісу першараднае значэнне мае стварэнне ***станоўчай матывацыі для разгорнутых выказванняў***. Для засваення марфалогіі і словаўтварэння важна выкарыстоўваць ***дыдактычныя гульні і практыкаванні з граматычным зместам***, якія з'яўляюцца важным ***сродкам стымулявання моўных гульняў дзяцей, іх пошукавай актыўнасці ў сферы граматыкі.***

Асаблівае месца ў рабоце з дзецьмі 5–6 гадоў адводзіцца *гульням і практыкаванням, заснаваным на вершаваным займальным матэрыяле*. Роля паэтыкі ў антагенезе чалавека надзвычай вялікая. Даследчыкі (І. П. Грэхава і інш.) сцвярджаюць, што вершаванае маўленне слаба, несістэматычна і неадпаведна свайму значэнню прадстаўлена ва існуючай практыцы дзіцячага маўленчага развіцця, што не дазваляе дзіцяці паспяхова авалодваць паўнавартасным маўленнем. Развіццё дзіцячага маўлення, не праходзячы неабходнага этапу паэтычнай метафарызацыі, актыўна згортваецца. Вершаваны этап можна папоўніць у вучэбнай сітуацыі — сітуацыі каштоўнасных зносін з нагоды маўлення ў самым шырокім сэнсе слова*.

Зыходзячы са сказанага, зразумела, наколькі важную ролю ў засваенні дашкольнікамі і шасцігадовымі вучнямі моўных з'яў адыгрывае займальны матэрыял: пацешкі, загадкі, прыказкі, скорагаворкі, вершы, лічылкі і інш. З дапамогай такога матэрыялу педагог можа выклікаць і падтрымліваць у дзяцей непасрэдную цікавасць да роднай мовы, у пэўнай меры пераадольваць іх эмацыянальную няўстойлівасць, засяроджваць увагу дзяцей на моўных з'явах, з якімі іх знаёміць. Мастацкія творы садзейнічаюць развіццю вобразнага маўлення, фарміраванню паэтычнага слыху, пачуцця рытму. Дашкольнікі і малодшыя школьнікі лёгка запамінаюць гэтыя творы і выкарыстоўваюць у самастойнай дзейнасці, што ўзбагачае іх маўленне.

Разам з моватворчасцю, аднаго з важнейшых складальнікаў дзіцячай камунікатыўнай дзейнасці, выступае дыялог як від маўленчых зносін. Таму педагогам, якія працуюць з дзецьмі 5–6 гадоў, важна навучанне ажыццяўляць у форме сеансаў (урокаў) актывізуючых зносін. Сцэнарый зносін уключае размову педагога з дзецьмі, дыялогі дзяцей паміж сабой, моўныя гульні і пошукавую дзейнасць дзяцей у сферы мовы і маўлення. Гэта садзейнічае развіццю як дыялагічных зносін, так і слоўнай творчасці дашкольнікаў і малодшых школьнікаў.

Ніжэй прыводзяцца прыкладныя сцэнарыі актывізуючых зносін па фарміраванні ў дзяцей старэйшага дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту граматычнага ладу маўлення, а дакладней — азнаямленне са спосабамі словаўтварэння (назваў дзіцянят жывёл, прафесій, людзей і інш.).

З кожнага сцэнарыя педагог можа выбраць тое, што з'яўляецца найбольш прыдатным для групы ці класа, у якім ён працуе. Заняткі можна скарачаць, праводзіць не за адзін раз, камбінаваць. Галоўнае, каб яны праходзілі жыва і весела, у свабоднай непрымусовай абстаноўцы.

* *Грехова И. П.* Стихосложение как форма развития детской речи. — М., 1998.

# Гульні і практыкаванні на ўтварэнне назваў жывёл і іх дзіцянят

## Хто у каго?

_та:_ вучыць суадносіць назвы жывёл і іх дзіця- ірактыкаваць ва утварэнні назваў дзіцянят жы-

_тэрыял:_ прадметныя малюнкі з выявамі жывёл ізіцянят: сарока і сарачаня, грак і грачаня, трус і іня, кошка і кацяня, качка і качаня і інш.

_ганізацыя._ Педагог загадвае загадку:

Гэта птушка белабока,
А завуць яе ... _(сарока)._

Іры неабходнасці паказвае малюнак з выявай .)

Хто яе дзіцяня?
Безумоўна ... _(сарачаня)._

лі дзеці адчуваюць цяжкасць пры адказе, педа- дказвае слова. Затым, паказваючы адпаведныя нкі, зазначае: «Так, гэта сарока і сарачаня».

эапануе адгадаць іншыя загадкі:

Усіх птушак ён чарней,
Чысціць поле ад чарвей. _(Грак.)_

У гэтай загадкі ёсць працяг. Паслухайце і паспра- дагаварыць радок:

рака дзіцяня,
а пэўна ...

дагог паказвае малюнак з выявай грачаня. Дзеці ворваюць: «Грачаня».

эдагог паказвае наступныя малюнкі, чытаючы ык:

У грака — грачаня,
У трусіка — ... _(трусяня)._
У трусіка — трусяня,
У качкі — ... _(качаня)._
У качкі — качаня,
У курыцы — ... _(кураня)._

эдагог можа працягваць загадку, выкарыстоў- ы назвы іншых жывёл і іх дзіцянят. Затым прапа- ецям прыдумаць працяг загадкі. Дзеці па адным мваюць загадкі тыпу:

У курыцы кураня,
У зайца — ...

:татнія дзеці адгадваюць. Каб гульня праходзі- астаткова хуткім тэмпе, педагог можа выкары- ваць падказкі-малюнкі з выявамі жывёл. (Дзеці ць прыдумаць загадкі з назвамі жывёл, што не ссяцца з назвамі іх дзіцянят: у сабакі — шчаня, вы — цяля. У такім выпадку педагог сочыць равільнасцю ўжывання слоў. Калі дзеці прыдум- ь загадкі з жывёламі, дзіцяняты якіх не маюць яльнай назвы — бегемот, насарог, чарапаха г. п., педагог звяртае ўвагу на гэта, паведам- ы, што гэтых дзіцянят называюць _маленькі бегe- ракадзільчык, чарапашка_, можна пра іх сказаць: _ка насарог, крошка бегемот._)

## Хто каго лашчыць?

_эта:_ вучыць суадносіць назвы жывёл і іх нят, практыкаваць ва ўтварэнні назваў дзіцянят л.

**_Матэрыял:_** прадметныя малюнкі з выявамі жывёл (птушак) і іх дзіцянят: ліса і лісяня, ласіха і ласяня, леў і львяня, тыгр і тыграня, зубраня, ваўчаня, бабраня, зебраня і інш.

**_Арганізацыя._** Педагог, выкарыстоўваючы адпавед- ныя малюнкі, чытае верш Ю. Кругляка :

Ліска лашчыць лісяня,
А ласіха — ласяня.
Леў ласкава лапаю
ільвяня паляпвае.

— Чаму звяры лашчаць сваіх дзіцянят? _(Таму што яны іх любяць.)_ Так, усе жывёлы любяць сваіх дзіцянят, лашчаць іх. Як леў, цар звяроў, паляпвае львяня? _(Ла- скава.)_ Мы з вамі можам самі прыдумаць вершыкі пра розных птушак і жывёл. Я буду пачынаць, а вы праця- вайце. (Можна паказваць адпаведныя малюнкі.)

Ліска лашчыць лісяня,
Аляніха — ... _(аленяня)._
Львіца лашчыць ... _(ільвяня),_
Кошка лашчыць ... _(кацяня)._
Тыгрыца лашчыць ... _(тыграня),_
А ваўчыха — ... _(ваўчаня)._
Качка лашчыць ... _(качаня),_
А гусыня — ... _(гусяня)._

Гульня можа працягвацца, пакуль не надакучыць дзецям. Можна прапанаваць ім самім прыдумаць рыфмоўкі «пра жывёл і іх дзіцянят».

Напрыканцы гульні педагог прапануе сабраць усіх дзіцянят жывёл у дзіцячы сад. Потым чытае верш Станіслава Валодзькі, паказваючы адпаведныя малюнкі:

Вось бы разам сабраць
Усіх зveранят:
Зубраня,
Зебраня,
Ласяня,
Лісяня,
Ваўчаня, бабраня —
Быў бы і ў заасадзе
Дзіцячы сад.

Педагог пытаецца, якіх яшчэ зверанят дзеці хацелі б сабраць у дзіцячым садзе.

## Тата, мама і дзіця

**_Мэта:_** вучыць суадносіць назвы жывёл, што абазна- чаюць істот мужчынскага і жаночага роду, і іх дзіцянят; практыкаваць ва ўтварэнні назваў дзіцянят жывёл.

**_Матэрыял:_** малюнкі з выявамі сем'яў жывёл: зубр, зубрыха і зубраня; тыгр, тыгрыца і тыграня; ліс, ліса і лісяня; лось, ласіха і ласяня; леў, львіца і львяня і г. д., дзве зебры і зебраня.

**_Арганізацыя._** Педагог гаворыць, што ў яго ёсць карціны, на якіх намаляваны звяры, але не проста асобныя звяры, а звярыныя сем'і: тата, мама і дзіця. Кожны з іх мае сваю назву.

Паказвае дзецям малюнак з зубрынай сям'ёй, чы- тае вершык Таццяны Шылько:

Тата — зубр, зубрыха — мама,
І дзіця ў іх ёсць таксама,
Мае гучнае імя. А якое?.. _(Зубраня.)_

— Значыць, тата у гэтай сям'і — зубр, а як называюць маму? *(Зубрыха.)* Хто іх дзіцяня? *(Зубраня.)*

— А вось яшчэ адна звярыная сям'я. (Паказвае малюнак з выявай львоў.) Хто тут тата? *(Леу.)*

Тата — леу, ільвіца — мама,
І дзіця у іх ёсць таксама,
Мае гучнае імя. А якое?.. *(Ільвяня.)*

— Вось мы з вамі склалі вершык пра львіную сям'ю. Давайце паспрабуем прыдумаць вершык пра ласіную сям'ю. (Паказвае малюнак.) Я пачну, а вы працягвайце:

Тата — ... *(лось)*, ласіха — мама,
І дзіця у іх ёсць таксама,
Мае ... *(гучнае імя)*. Я якое?.. *(Ласяня.)*

Педагог паказвае некалькі малюнкау з выявамі сем'яу звяроу, просіць прыдумаць пра іх вершык, дапамае дзецям утварыць назву маладой істоты.

Паказвае малюнак з выявай зебрау і іх дзіцяняці. Пытаецца, што гэта за паласатыя коні. Чытае урывак з верша Л. Рашкоускага:

Вось дык конік —
Дзіуны нейкі,
Быццам сшытак
У лінейку!

— Хто гэта? *(Зебры.)* Дзе яны жывуць? *(У Афрыцы.)* Як можна назваць тату і маму у гэтай сям'і?

Дзеці спрабуюць прыдумаць адпаведныя назвы. Педагог паведамляе, што такіх назвау няма: і тату, і маму называюць аднолькава — зебра. Значыць, які будзе наш вершык?

Тата — ... *(зебра)*, зебра ... — *(мама)*,
І дзіця у іх ёсць таксама,
Мае ... *(гучнае імя)*. Я якое?.. *(Зебраня.)*

— Што ядуць зебры? *(Яны шчыплюць траву, як і коні.)* Паэтка Ніна Галіноуская напісала такі жартоуны вершык пра тату і маму зебрау:

Зебра зебру дакарала:
— Мала траукі ты нарвала.
Будуць румзаць зебраняты,
Во жывоцік пуставаты.

— У вершы гаворыцца: «Зебра зебру дакарала...» Хто ж каго дакарау: тата маму ці мама тату? Як мы можам даведацца? Паслухайце наступны радок: «Мала траукі ты нарвала...» Пра каго можна сказаць «нарвала»: тату ці маму? Значыць, тата-зебра казау маме-зебры: «Мала траукі ты нарвала...» А як далей? «Будуць румзаць ... хто? *(зебраняты)*, бо жывоцік ... *(пуставаты)*». Хто хоча расказаць гэты вершык?

## Найсапраудная радня

***Мэта:*** вучыць суадносіць назвы жывёл, што абазначаюць істот мужчынскага і жаночага роду, і іх дзіцянят; практыкаваць ва утварэнні назвау істот жаночага роду і дзіцянят жывёл.

***Матэрыял:*** малюнкі з выявамі сем'яу жывёл: тыгр, тыгрыца і тыграня; ліс, ліса і лісяня; лось, ласіха і ласяня, леу, львіца і львяня і г. д., два кенгуру і кенгураня у сумцы.

***Арганізацыя.*** Педагог, выкарыстоуваючы адпаведны малюнак, чытае вершык:

Тыгр, тыгрыца, тыграня —
Найсапраудная радня.

— Чаму тыгр, тыгрыца і тыграня — радня? Як яшчэ можна пра іх сказаць? Тыгр, тыгрыца і тыграня — гэта... *(сям'я)*. Хто у іх тата? Мама? Дзіцяня? Дзе яны жывуць? У кожных жывёл можа быць такая сям'я. Мы можам самі сачыніць пра іх рыфмоукі.

Педагог паказвае малюнкі з выявамі сем'яу жывёл, а дзеці складаюць рыфмоукі тыпу:

Ліс, лісіца, лісяня —
Найсапраудная радня.

Педагог просіць назваць тату, маму і дзіцяня, пытаецца, дзе яны жывуць.

— А помніце, мы з вамі прыдумвалі вершык пра сям'ю зебрау?

Тата — ... *(зебра)*, зебра ... — *(мама)*,
І дзіця у іх ёсць таксама,
Мае ... *(гучнае імя)*. Я якое?.. *(Зебраня.)*

— Так, і тата, і мама у гэтай сям'і называюцца аднолькава — ... *(зебра)*. А дзіцяня ... *(зебраня)*. Гэта таксама найсапраудная радня. Які ж новы вершык можна пра іх скласці?

Зебра, зебра, зебраня —
Найсапраудная радня.

Педагог паказвае малюнак з выявай сям'і кенгуру. Пытаецца, як можна назваць тату і маму кенгуру. Дзеці могуць паспрабаваць прыдумаць назвы. Выхавальнік паведамляе, што такіх назвау таксама няма: і тату, і маму называюць аднолькава — кенгуру. А іх дзіцяня? *(Кенгураня.)* Дзе яны жывуць?

Звяртае увагу, што кенгураня сядзіць у мамы у сумцы на жываце, зачытвае вершык:

Утульная кватэра
У кенгураняці.
Такая дастаецца
Не кожнаму дзіцяці.

— У кенгуру ёсць сумка, таму гэтая жывёла называецца сумчатай. У Аустраліі жывуць і іншыя сумчатыя жывёлы. Хто ведае, якія?

— Гэта сумчаты мядзведзь, яго яшчэ называюць каала. Ёсць сумчатыя барсукі, сумчатыя краты і іншыя сумчатыя жывёлы. Усе яны носяць сваіх дзіцянят у сумках на жываце. А жывуць усе сумчатыя жывёлы у... Аустраліі.

## Назаві сям'ю

***Мэта:*** практыкаваць ва утварэнні назвау жывёл, што абазначаюць істот мужчынскага і жаночага роду, і іх дзіцянят; звярнуць увагу дзяцей на спосаб утварэння прыналежных прыметнікау: гусіны, арліны і да т. п.; вучыць здагадвацца аб сэнсе незнаёмых слоу («непамыцькі» , «чубатка» ).

***Матэрыял:*** малюнкі з выявамі сем'яу жывёл і птушак: асёл, асліха, асляня; арол, арліца, арляня; гусак, гусыня, гусяня (плаваюць у вадаёме); індык, індычка, індычаня (у вясковым двары); певень, курыца, кураня і г. д.

***Арганізацыя.*** Педагог нагадвае дзецям, што у мінулы раз яны складалі рыфмоукі пра «сем'і» жывёл.

— Хто успомніць гэтыя вершыкі? (Некалькі дзяцей узгадваюць рыфмоукі пра звярыныя сем'і.)

Педагог кажа, што пра сем'і жывёл і птушак можна расказаць і трошкі інакш. Вось, напрыклад, які вершык прыдумау паэт Авяр'ян Дзеружынскі пра гэтую сям'ю (паказвае малюнак з выявай сям'і аслоу):

Асёл,
Асліха, асляня —
Адна
Адзіная сям'я.

Пра якую сям'ю гэты вершык? Так, пра сям'ю ... Інакш можна сказаць: пра асліную сям'ю.
...рапануе прыдумаць вершык пра арліную сям'ю ...звае адпаведны малюнак):

Арол,
Арліца, арляня —
Адна
Адзіная сям'я.

А вось яшчэ адна птушыная сям'я. (Паказвае ...юнак з выявай індычынай сям'і.) Хто ж гэта? Як на...ецца гэтая птушка? *(Індык.)* Паэт Міхась Пазнякоў ...ніў пра гэтую сям'ю такі верш:

Чародкай невялічкай
Пахаджваюць ля хаты
Індык з індычкай
І індычаняты.

Значыць, у гэтай сям'і тата — індык, а мама — *...ндычка).* Хто у іх дзіцяня? *(Індычаня.)* Давайце ...умаем свой вершык пра індычыную сям'ю:

Індык,
Індычка і індычаня —
Адна
Адзіная сям'я.

...налагічна дзеці складаюць рыфмоўку пра гусіную ...:

Гусак,
Гуска, гусяня —
Адна
Адзіная сям'я.

Гусіная сям'я вельмі дружная. Паглядзіце, што ...робяць. *(Купаюцца, плаваюць.)* Так, гусі вельмі ...ць купацца. Вось як пра іх расказаў паэт Васіль ...ак:

Раніцай да ручая
Уся гусіная сям'я
Пакупацца ходзіць,
Карагоды водзіць.
А гусак на беражок
Выйдзе
Дзюбай тыцкае:
— Дзе ж астатнія?! Няўжо
Ходзяць непамыцькамі?

Што значыць «непамыцькамі»? Хто здагадаўся, ...азначае слова «непамыцькі»? Васісь Зуёнак так ...у гусянят, якія не памыліся, не пакупаліся.

А вось яшчэ вельмі знаёмая сям'я (паказвае ма...к з выявай пеўня, курыцы і куранят). Тут тата — ... *...нь),* мама — ... *(курыца),* а дзеці — ... *(кураняты).* ...ершык мы можам прыдумаць пра гэтую сям'ю?

Певень,
Курыца і кураня —
Адна
Адзіная сям'я.

...тая сям'я таксама вельмі дружная. Знойдзе пеў...рнятка і кліча курыцу і куранят, каб яны пачаста...я. Вось як пра гэта расказваецца ў вершы ...фімы Беставай:

Певень клікае чубатку:
— Ко-ко-ко! — знайшоў зярнятка.
На, нясі яго дахаты,
Пачастуй там куранятак.

Хто такая чубатка? Чаму аўтар назваў курыцу ...кай? (Таму што ў яе на галоўцы невялікі грабя...ібы чубчык.). Давайце разам раскажам гэты ...ык:

Певень клікае ... *(чубатку):*
— Ко-ко-ко! — знайшоў ... *(зярнятка).*
На, нясі яго ... *(дахаты),*
Пачастуй там ... *(куранятак).*

## Мамы і дзеткі

***Мэта:*** вучыць суадносіць назвы жывёл і іх дзіцянят, практыкаваць ва ўтварэнні назваў дзіцянят жывёл у множным ліку; вучыць здагадвацца аб сэнсе незнаёмых слоў («трушком», «квахтуха»).

***Матэрыял:*** малюнкі з выявамі сем'яў жывёл і птушак, у якіх шмат дзіцянят: гусыня, гусяняты; курыца, кураняты; качка, качаняты; варона, вараняты; галка, галчаняты; бабёр, бабраняты і г. д. Можна выкарыстаць карціны тыпу «Птушыны двор» , «Вясковы двор».

***Арганізацыя.*** Педагог зноў нагадвае дзецям, што ў мінулы раз яны складалі рыфмоўкі пра сем'і жывёл і птушак. Прапануе ўспомніць гэтыя вершыкі. Некалькі дзяцей узгадваюць рыфмоўкі пра звярыныя сем'і.

Педагог паведамляе, што ў жывёл і птушак звычайна многа дзіцянят. Мамы іх усіх любяць, даглядаюць, водзяць за сабой. Вось, напрыклад, як напісаў пра сям'ю гусі Артур Вольскі (паказвае адпаведны малюнак):

Гусь уранні
Выйшла з хаты.
Важна тупае
Лажком.
А за ёю
Гусяняты
Дзе падскокам,
Дзе трушком.

Пытаецца, хто ідзе за гускай? *(Яе дзеткі гусяняты.)* Гусь ідзе важна, значыць, як? *(Не вельмі хутка, нават павольна.)* А дзеткі яшчэ маленькія, за мамай не паспяваюць. Таму яны спяшаюцца «дзе падскокам, дзе трушком» . Што значыць трушком? Трушком — значыць подбегам. Гусяняты то падскокваюць, то падбягаюць, каб паспець за мамай. Можна сказаць, гусяняты трусяць за гускай.

— Хто яшчэ жыве на птушыным двары? Канешне, куры. Як называецца курыца, у якой ёсць маленькія дзеткі-кураняты? *(Квахтуха.)* Чаму яна так называецца? *(Яна квохча, калі кліча куранятак.)* Выхавальнік чытае вершык Міколы Чарняўскага, выкарыстоўваючы адпаведны малюнак:

За квахтухай
Да цямочку
Жвава бегаюць
Клубочкі:
— Дзе тварог?
А дзе зярняткі?
Яны завуцца ... *(куранятКі).*

Паказваючы адпаведныя малюнкі або карціну, чытае вершык Уладзіміра Карызны:

Ходзіць курыца
Ля хаты,
А за ёю —
Кураняты.
А за качкай —
Качаняты.
І за гускай —
Гусяняты.
(Можна дагаворваць радкі.)

— А вось яшчэ адна птушка з дзіцяняткамі-птушаняткамі. Гэта лясная птушка, называецца перапёлка. Яе дзеткі таксама ходзяць за ёю. Хто дзеткі перапёлкі? *(Перапеляняты.)* Вось якое слова, нават цяжка вымавіць. А паэт Алесь Каско сачыніў вымаўлянку пра перапёлку і яе дзетак:

Перапёлка перапеляноўвала
мела занятак: перапелянятак.

— Паслухайце яшчэ раз. (Чытае паўторна.)

— Што рабіла перапёлка? Хто хоча расказаць скорагаворку? Я пачну:

Перапёлка перапеляноўвала
мела ... *(занятак)*: ... *(перапелянятак)*.

— Хто паспрабуе расказаць скорагаворку самастойна? (Дзеці па жаданні расказваюць скорагаворку, педагог пры неабходнасці дапамагае.) Малайцы. Вывучыце скорагаворку дома з бацькамі.

### Камарыны канцэрт

***Мэта:*** вучыць суаднosіць назвы жывёл, што абазначаюць істот мужчынскага і жаночага роду; практыкаваць ва ўтварэнні назваў істот жаночага роду, правільным ужыванні іх у родным і творным склонах; замацоўваць вымаўленне гука [з].

***Матэрыял:*** малюнкі з выявамі жывёл, птушак і насякомых: зубры, бабры, ласі, зайцы, ваўкі, барсукі, бурундукі, буслы, жукі, камары і інш.

***Арганізацыя.*** Педагог прапануе дзецям успомніць песеньку камара. Некалькі вучняў паасобку вымаўляюць: «З-з-з-з». Педагог працягвае: «Уявіце сабе, што спявае не адзін камар, а цэлая хмара камароў, што атрымаецца?» Дзеці разам цягнуць: «З-з-з-з-з-з».

— Атрымаўся сапраўдны камарыны канцэрт. Вось такі канцэрт наладзілі камары ў лесе. Паслухайце, як пра гэта расказвае паэт Пятро Сушко:

Каля пушчы,
Каля бору
Камары спявалі хорам.
Слухаць песню камароў
Шмат сабралася звяроў,
Дробных і буйнейшых,
Блізкіх і далейшых:
Сем зуброў з зубрыхамі,
Пяць баброў з бабрыхамі,
Два ласі з ласіхамі
І яшчэ два без ласіх...
Ці злічылі,
Колькі усіх?

Педагог павольна пералічвае звяроў, даючы дзецям магчымасць услухацца ў гучанне іх назваў:

Сем зуброў з зубрыхамі,
Пяць баброў з бабрыхамі,
Два ласі з ласіхамі
І яшчэ два без ласіх...

— Сем зуброў з зубрыхамі, значыць, зубрых было столькі, колькі зуброў. Колькі ж было зуброў? *(Сем.)* А зубрых? *(Таксама сем.)* Колькі усяго зуброў і зубрых? *(Чатырнаццаць.)*

— Было пяць баброў з бабрыхамі. Колькі бабрых? *(Пяць.)* Колькі ўсяго баброў і бабрых? *(Дзесяць.)*

— Два ласі з ласіхамі. Колькі ласіх? *(Дзве.)* А усяго ласей і ласіх? *(Чатыры.)*

— Малайцы, добра лічыце. Давайце прыдумаем самі такія вершы з іншымі звярамі і палічым іх. Хто яшчэ мог прыйсці на камарыны канцэрт?

Сем зайцоў з ... *(зайчыхамі)*,
Пяць ваўкоў з ... *(ваўчыхамі)*,
Два жукі з ... *(жучыхамі)*,
І яшчэ два без ... *(жучых)*.

— Колькі ж было зайцоў з зайчыхамі? *(Чатырнаццаць.)* Ваўкоў з ваўчыхамі? *(Дзесяць.)* Жукоў з жучыхамі? *(Чатыры.)* А без жучых? *(Два.)*

— Спадабалася вам складаць жартоўныя вершы? Давайце яшчэ паспрабуем. На камарыны канцэрт прыйшлі:

Сем буслоў з ... *(буслíхамі)*,
Пяць барсукоў з ... *(барсучыхамі)*,
Два бурундукі з ... *(бурундучыхамі)*
І яшчэ два без ... *(бурундучых)*.

— А камарыны канцэрт ладзілі камары з ... *(камарыхамі)*. Вясёлыя вершы ў нас атрымаліся.

## Поздравляем с юбилеем Наталью Степановну Старжинскую,

**доктора педагогических наук, профессора**
**Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка**



Наталья Степановна — профессор кафедры методик дошкольного образования Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка, авторитетный учёный в области методики обучения грамоте детей дошкольного и младшего школьного возраста, развития речи детей дошкольного возраста в условиях близкородственного двуязычия.

Н. С. Старжинская является одним из авторов концепции дошкольного образования Республики Беларусь, государственного стандарта «Дошкольное образование. Готовность к школе», концепции учебного предмета «Обучение грамоте» для I ступени общего среднего образования, программы дошкольного образования «Пралеска», учебных программ «Обучение грамоте», «Навучанне грамаце», факультативных занятий «Учимся говорить правильно» для I класса учреждений общего среднего образования.

Автор многочисленных пособий для педагогов и детей: «Весёлые игры для развития речи», «Речевая мозаика», «Учись говорить правильно» и др. Член редакционного совета нашего журнала.

Наталья Степановна! Примите искренние поздравления с юбилеем!

***Здоровья вам, добра и оптимизма,***
***Удачи и счастливых ярких дней,***
***Пусть будет всё благополучно в жизни***
***У вас, и ваших близких, и друзей!***

***Хотим Вам пожелать удачи.***
***Успеха в жизни, ярких дел,***
***Чтоб Вы с улыбкой — не иначе! —***
***Встречали каждый новый день!***